ДУА “Ударненская сярэдняя школа”

# канспект урока
# беларускай мовы

# “Назоўнік як часціна мовы”

Правяла: настаўнік 3 класа
Ю.Ф.Дашкевіч

Ударнае 2022

**Тэма: "Назоўнік як часціна мовы"**

**Мэта:** сфарміраваць уяўленне пра назоўнік як часціну мовы.

**Задачы:**

-даць агульнае ўяўленне пра назоўнік як часціну мовы; вучыць адрозніваць наоўнікі , якія адказваюць на пытанні хто? або што?

-садзейнічаць развіццю кругагляду, мыслення, памяці; пашырыць лексічны запас;

-выхоўваць любоў да Радзімы, цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

**Абсталяванне:** апорная схема “Назоўнік”, карткі, малюнкі.

## Ход урока

**1.Арганізацыйны этап**

**Настаўнік.**Паглядзіце ў акно. Які марозны і спакойны дзень. Якое сёння добрае надвор’е! Я думаю, што і ў вас, напэўна, такі ж добры настрой. Спадзяюся, што ён захаваецца ў вас да канца ўрока. Пажадаем ўсім поспехаў! За работу! У добры шлях!

**2. Этап праверкі дамашняга задання**

Пачынаем наш урок з праверкі дамашняга задання.

*Дамой вам было практыкаванне 78. Вам патрэбна было спісаць і знайсці і падкрэсліць сказ , у якім усе словы называюць прадметы.*

**3. Этап актуалізацыі ведаў**

Я вельмі хачу, каб наш урок сёння атрымаўся цікавым, займальным, прынёс шмат карысці. Якія якасці нам для гэта спатрэбяцца? Давайце прачытаем, якія якасці спатрэбяцца нам на ўроку.

ПРАЦАВІТАСЦЬ

ТВОРЧАСЦЬ

УВАЖЛІВАСЦЬ

ШПАРКАСЦЬ - быстрота

КЕМЛІВАСЦЬ - сообразительность

АРГАНІЗАВАНАСЦЬ

Складзіце з першых літар слова. Якое слова атрымалася? Атрымалася птушка.

Сення да нас ў госці прыляцела птушка, якая будзе мне дапамагаць сачыць за вашай працай.

А ці хочаце даведацца, што гэта за птушка? Тады слухайце загадку.

**3.1. Арфаграфічная размінка**

Загарэліся сумёты

І в__рба гарыць ля плота.

Кот на печы не ляж__ць,

Як мага хутчэй бяжы__ь.

Ведае хітрун стары

Прыляцелі_____ снегіры.
(Вывешваецца малюнак.)



А ці можна гэту птушку ўбачыць летам? Чаму? (Яна прылятае да нас зімаваць) Што вы ведаеце пра яе? (Снягір не баіцца холаду, корміцца ягадкамі рабіны, у яго прыгожае пер’е, прылятае ён да нас з поўначы))

Як мы з вамі можам дапамагчы птушкам перажыць зіму? (Адказы дзяцей). Трэба рабіць кармушкі, падкармліваць птушак, класці ў кармушкі зерне.

І вось вам першае заданне. Уставіць прапушчаныя літары.

**3.2.Чыстапісанне**

**Настаўнік.** Снегір прынёс памяткі, што неабходна памятаць, калі будзем пісаць.

**Памятай:** калі жадаеш пісаць прыгожа, неабходна мець вытрымку; няўдалыя элементы не абводзь па некалькі разоў, не “падмалёўвай”, не выцірай.

*во ве вя      во об бл ла ак ка*
*воблака- сл.слова*
(звяртаю ўвагу на вышыню і на нахіл літар).
-Якое слова схавалася ў гэтых злучэннях? (Воблака).
- Як вы разумееце значэнне слова *воблака* ?
-Зараз паслухаем спадара слоўніка.
**Воблака - бачная маса згушчанай вадзяной пары, якая плавае ў атмасферы, звычайна высока над зямлёй.**
Падбярыце аднакаранёвыя словы
**(7 л. 7 г. 3 скл)**
Складзіце сказ з гэтым словам:
Па небе плывуць прыгожыя воблакі.
-Запішыце ў сшыткі. Падкрэсліце дзейнік і выказнік.

**Настаўнік.**Кожная пара года па-свойму прывабная, прыгожая. Але толькі зімой бывае… А што бывае, вы даведаецеся, калі адгадаецце загадкі і адкажацце на пытанні. (МАЛЮНКІ)

1. Без голасу, а вые,
   Без рук, а абрусы сцеле. (*Мяцеліца*)
2. Ляцяць птушкі без крыл,
   На дрэва садзяцца без ног. (*Сняжынкі*)
3. На двары гарой, а ў хаце вадой. (*Снег*)

4. Як называецца казачная дзяўчынка са снегу з народнай казкі? (*Снягурачка*)
5. Як называецца дзед, зроблены са снегу? (*Снегавік*)

- Пастаўце да гэтых слоў пытанні. На якія пытанні адказваюць словы?Хто здагадаўся, якая тэма нашага ўрока?

**4. Этап паведамленне тэмы ўрока, мэтанакіраванне**

- Тэма нашага сенняшняга ўрока “Назоўнік як часціна мовы”.
- Якія мэты вы паставіце перад сабой? Што вы павінны ведаць і ўмець?

Даведацца што такое назоўнік. На якія пытанні адказуе назоўнік

- Сёння на ўроку мы з вамі запоўнім калектыўна кластар па гэтай тэме.

КЛАСТАР (У КОЖНАГА ВУЧНЯ ЛІСТ З КЛАСТАРАМ)

НАЗОЎНІК

ЧАЦІНА МОВЫ    ЗНАЧЭННЕ    ПЫТАННІ    ЧЛЕНЫ СКАЗА    ?

?    ?    ?    ?    ?

- Усе словы нашай мовы падзяляюцца на вялікія групы у залежнасці ад значэння. Гэтыя групы называюцца часцінамі мовы. Гэтых груп усяго 10. Першую групу складае назоўнік.

**5.Этап вывучэнне новага матэрыялу.**

Заданне1. Практыкаванне 79. Прачытайце. Выпішыце словы-назвы прадметаў.

*Максім сядзіць у бацькавым кабінеце і чытае казкі. Па пакоях гуляе лёгкі ветрык.Ад ветру надзімаюцца фіранкі на вокнах.*

-Вусна пастаўце пытанні да выпісанных слоў. На якія пытанні яны адказваюць?

**Правіла.Назоўнік часціна мовы. Словы-назвы прадметаў – гэта назоўнікі. Яны адказваюць на пытанні хто? або што?**

Вучні запаўняюць кластар.

Заданне 2. Разгледзце малюнкі. Выпішыце толькі назоўнікі. Вусна пастаўце да іх пытанні.



-На якія пытанні адказваюць выпісанныя словы? Як вы думаеце, чаму да адных слоў ставім пытанне хто?, а да другіх – што?

**Правіла.Назоўнікі, якія абазначаюць людзей і жывёл, адказваюць на пытанне хто?Назоўнікі, якія абазначаюць рэчы, расліны, адзенне і іншыя прадметы, адказваюць на пытанне што?**

Вучні запаўняюць кластар.

**Фізкультхвілінка.**

Заданне 3. Практыкаванне 80.Прачытайце верш.Падзяліце выдзеленыя словы на дзве групы:

- ✓ словы, якія называюць жывыя прадметы (хто?);
- ✓ словы, якія называюць нежывыя прадметы (што?)

***Хмара, слон, ягуар, мядзведзь, янот, бегемот,сабака, кракадзіл, гарыла,дом.***

***6.Этап замацавання ведаў***

**Настаўнік.**Пакуль мы дзялілі словы, падуў моцны вецер і рассыпаў сказы. Збярыце словы і складзіцеце з іх сказы.

*1 узровень.* Гурбы, намяла, снегу, завіруха.

*2 узровень.* У, ціха, закружыўся, паветры, снег.

**Настаўнік.**Падкрэсліць галоўныя члены сказа. Якой часцінай мовы выражаны дзейнік? Які можна зрабіць вывад? Пастаўце пытанне да слова *пад коўдрай,* якая часціна мовы? Чым з’яўляецца ў сказе?

**Правіла. У сказе назоўнікі часцей за ўсё бываюць дзейнікамі або даданымі членамі сказа.**

Вучні запаўняюць кластар.

Заданне 4.**Практыкаванне 82**. Да слоў з левага слупка падбярыце сінонімы з правага слупка. Запішыце спачатку словы, якія адказваюць на пытанні хто?, а потым на пытанні што?

Сябар-прыяцель

Бегемот—гіпапатам

Тайна-таямніца

Шум-гул

Сіла-моц

**7.Этап абагульнення ведаў**

**Гульня “Засялі домік”**



Што?



Хто?

*Ліса, вучань, кармушка, воўк, снег, дрэвы, лёд, карова, снегір, мароз*

*8.***Этап паведамлення дамашняга задання**

Пр.85,с51

**9. Этап падвядзенне вынікаў урока**

-Як называецца часціна мовы, з якой мы пазнаёміліся?

-На якія пытанні адказваюць назоўнікі?

**10.Этап рэфлексіі**

**Настаўнік.**

**Прадоўжы сказ….**

Каму было ўсё зразумела і лёгка, падаруйце елачцы блакітную сняжынку.

У кого сустракаліся некаторыя цяжкасці – фіялетавую.

Каму было цяжка – ружовую.

**11. Этап выстаўлення адзнак**